Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

СНЕЖАНЬ 21 1933 г. ЧАЦВЕР № 281 (4825) Год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

АД РЭСПУБЛІКАНСКАЙ КАМІСІІ ПА ЧЫСТЦЫ КП(б)Б

1. ЦЭНТРАЛЬНАЙ КАМІСІЯЙ ВКП(б) ПА ЧЫСТЦЫ ДЛЯ ПАДАЧЫ АПЕЛЯЦЫЙ УСТАНОЎЛЕН МЕСЯЧНЫ ТЭРМІН З ДНЯ АТРЫМАННЯ РАШЭННЯ КАМІСІІ ПА ЧЫСТЦЫ. НА ПАДСТАВЕ ЎКАЗАНАЙ ДЫРЭКТЫВЫ РЭСПУБЛІКАНСКАЯ КАМІСІЯ ПА ЧЫСТЦЫ КП(б)Б ПАВЕДАМЛЯЕ, ШТО АД ТАВАРЫШОЎ, ЯКІЯ ПАРУШЫЛІ ЦІ БУДУЦЬ ПАРУШАЦЬ УСТАНОЎЛЕНЫ ТЭРМІН, АПЕЛЯЦЫІ ПРЫМАЦЦА НЕ БУДУЦЬ.

2. У СУВЯЗІ З ТЫМ, ШТО МНОГІЯ ТАВАРЫШЫ, ПАДАЎШЫЯ АПЕЛЯЦЫІ Ў РЭСПУБЛІКАНСКУЮ КАМІСІЮ, ВЫЯЖДЖАЮЦЬ У МЕНСК БЕЗ УСЯКАГА ВЫКЛІКА, РЭСПУБЛІКАНСКАЯ КАМІСІЯ Ў МЭТАХ ПАПЯРЭДЖАННЯ ДАРЭМНЫХ ПАЕЗДАК ЯШЧЭ РАЗ ПАВЕДАМЛЯЕ ЎСІХ АПЕЛЮЮЧЫХ, ШТО БЕЗ ВЫКЛІКА Ў МЕНСК НІ Ў ЯКІМ ВЫПАДКУ ВЫЯЖДЖАЦЬ НЕ ТРЭБА, І ШТО КОЖНЫ АПЕЛЮЮЧЫ СВАЯЧАСОВА БУДЗЕ ПАВЕДАМЛЕН АБ ДНІ І МЕСЦЫ РАЗБОРА ЯГО АПЕЛЯЦЫІ.

3. У ВЫПАДКУ ПЕРАМЕНЫ МЕСЦА ЖЫХАРСТВА, АПЕЛЮЮЧЫЯ ПАВІННЫ ПАВЕДАМІЦЬ У РЭСПУБЛІКАНСКУЮ КАМІСІЮ СВАЕ НОВЫЯ АДРАСЫ.

РЭСПУБЛІКАНСКАЯ КАМІСІЯ ПА ЧЫСТЦЫ КП(б)Б.

УСЕ СІЛЫ НА ЗАВЯРШЭННЕ ІЛЬНАЗАҐАТОВАК

ЗЛАМАЦЬ КУЛАЦКІ САБАТАЖ, ЛІКВІДАВАЦЬ АДСТАВАННЕ У СПАБОРНІЦТВЕ З ЗАХОДНЯЙ ВОБЛАСЦЮ, ПЕРАКЛЮЧЫЦЬ НЕ МЕНШ 80 ПРОЦ. КАЛГАСНІКАЎ НА ПЕРААПРАЦОЎКУ І ЗДАЧУ ІЛЬНУ

ПА-УДАРНАМУ ЗАВЯРШЫЦЬ ІЛЬНАЗАГАТОЎКІ

Асноўныя ільнаводчыя раёны Совецкага Саюза пастаянова завяршаюць ільназагатоўкі. Большэвікі МАСКОЎСКАЙ вобласці паказалі пры слад аперацыйнага і канкрэтнага кіраўніцтва і дабіліся поўнага выканання плана ільназагатовак. Наближаюцца да завяршэння загатовак ільнатрадуктыў Ленінградская, Іва- — вобласці і Горкаўскі край. Крочыць ганебна адстала ў загатовах Ярославская вобласць. З кожнай пяцідзнеўкай Крочык, ніц пагаўбляецца напа

Збянтэжа спаборніцтве з Заходзела хвал.

паможна калгасы, сельсоветы і го хвалююць, што БССР па ільпапошніх так і па збожжы, мела газеце быці запяць ганаровае мес дамленне фрадавікоў.

амаль ніодзін не скарыстаў гэцёлак ініцыятыў, але за апошнія дні вацца? абілі тэмпы ільназагатовак.

Адна — яўная пагроза зрыва ныні ня плана ў тэрміны, вызгазеты партыяй і ўрадам.

прычыны адставання БССР можкумасачыць на прыкладзе неказато-

Пяноўных ільнаводчых раёнаў. ета СЦІСЛАЎСКІМ раёне па прычыне як кіраўнікоў, так і калгаснікаў, сёлета ўраджай тэхнічных культур быў даволі высокі. Лён быў свячасова ўбран і разасланы на сцеліпчах. Але раённыя арганізацыі на гэтым супакоіліся. Да 1-га снежня ў раёне зусім не дбалі пра лён. Упаўнаважаны РК і РВК па загатоўках збожжа і бульбы былі адкліканы з сельсоветаў, спадзяючыся на тое, што лён пойдзе самацёкам. Толькі ў першых лічбах снежня, пасля таго як раён быў занесен на чорную дошку, тут загаварылі пра лён. Але замест канкрэтнага аперацыйнага кіраўніцтва і дапамогі калгасам у арганізацыі працы па перапрацоўцы ільну, райком партыі і райвыканком далей гучных дэкларацый не пашлі.

Толькі ў снежні кіраўнікі раёна да зліся, што ў Тагерыгінскім сельсавеце сотні тон трасты асталіся зімаваць на сцеліпчах. У большасці калгасаў дагэтуль ящчэ не выручаны пастаянныя звенні для перапрацоўкі ільну. Гэта прывяло да таго, што ў радзе калгасаў больш паловы калгаснікаў зусім не выходзяць на перапрацоўку ільну.

Кіраўніцтва Мсціслаўскага раёна не заўважыла падрыўной работы класавага ворага, не заўважыла кулацкага сабатажу, раскрадвання і асушвання ільнатрадукцыі са сцеліпчаў і сушняў. Гэта і прывяло да таго, што Мсціслаўскі раён увесь час не выходзіць з чорнай дошкі зрыўчыкаў ільназагатовак і знаходзіцца на апошнім месцы на групе ільнаводчых раёнаў.

Прычыны адставання Мсціслаўшчыны ў той ці іншай ступені характэрны для большасці раёнаў БССР.

Выключна ніякае значэнне ў ільназагатоўках мае правільная арганізацыя працы, заахвочванне ўдарнікаў, выдача хлеба і прамтавараў, каб кожны калгаснік ведаў, што ён атрымлівае хлеб свячасова і поўнасцю ня за кольгаспы, так і за якасцю пагазальнікі снапі работы. Аб тым з усёй выразнасцю даводзіць у сваім лісце намеснік старшыні калгаса «Нямойта», Сенненскага раёна, які мы сёння змяшчаем.

У большасці раёнаў кіраўніцтва не спускаецца на мяльна-сушыльны пункт, у брыгаду, ад якой залежыць поспех ільнапрацоўкі.

Брыгадзір, — галоўная кіруючая фігура, — на волашыбу. Гэта скарыстоўвае класавы вораг для развала працоўнай дысцыпліны ўнутры брыгады, для зрыва перапрацоўкі ільну.

Возьмем ГОРАЦКІ раён. Кіраўніцтва ўвесь час націсканае і патрабуе ад кіраўнікоў сельсоветаў, але зусім не цікавіцца, што робіцца ў калгасной брыгадзе. Гэта прыводзіць да таго, што ў калгасе «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА» з 50 жанчын, выдзеленых для работы на ільнапрацоўчым пункце, працуе толькі 6. У комуне «БЕЛАРУСЬ» з 60 жанчын выходзіць на работу 10.

Нароўні мала ўвагі аддаецца пытанням арганізацыі працы, сведчыць той факт, што ў большасці калгасаў ГОРАЖСКАГА раёна на мяльна-сушыльных пунктах працуюць не больш 5-6 гадзін.

У Горацкім раёне пры размеркаванні прамтавараў і хлеба ў большасці калгасаў практыкуецца кулацкая раўнілаўка, незалежна ад колькасці і якасці выпрацаванага кожным калгаснікам ільнавалакна.

Асабліва агіднае становішча з размеркаваннем атрыманых прамтавараў мы маем па ЛЕПЕЛЬСКАМУ раёну. У калгасе «ПЕРАМОГА» хлеб і прамтавары, атрыманыя за лён, праўленне ўтойвае і не размяркоўвае сярод калгаснікаў. У выніку большасць калгаснікаў на работу не выходзяць. Калгас ганебна зацягвае апрацоўку і здачу валакна.

Дырэктыва партыі і ўрада аб рэгулярнай выдачы хлеба і прамтавараў тым калгаснікам, якія непасрэдна працуюць на ільну, павінна быць неадкладна выканана.

Больш трэці рэспубліканскага плана загатовак ільнавалакна прыпадае на так званыя неільнаводчыя раёны. Аб ходзе ільназагатовак па гэтых раёнах сведчыць той факт, што калі па ільнаводчай зоне план выкананы на 51 проц., то па неільнаводчай зоне — усяго на 38 проц.

У гэтых раёнах парашылі, што лён для іх другарадная справа.

— «Нас за лён біць не будуць», — так разважалі кіраўнікі Клімавіцкага раёна. Такія-ж настроі да апошніх дзён панавалі ў Буда-Кашалёўскім, Уваравіцкім, Чырвонапольскім і радзе іншых раёнаў. Вынікам гэтых апартуністычных настрояў з'яўляецца адсутнасць усякай масавастрэтумачальнай работы сярод калгаснікаў і аднаасобнікаў. Кулацкі сабатаж тут не сустракае ніякага адпора.

У Клімавіцкім раёне па раду сельсоветаў ні калгасы, ні аднаасобнікі ящчэ не прыступілі да здачы ільнавалакна. У Асмоловіцкім, Буцявіцкім, Мілаславіцкім і інш. сельсоветах лён даўно падняты са сцеліпчаў і на палову апрацаван, але на пункты яго не вязуць. Пад уплывам кулацкай агітацыі тут пачалі размяркоўваць лён паміж калгаснікамі. У калгасе «III Інтэрнацыянал» высокаякасная траста, якая можа даць валакно 10-12 нумара, утойваецца, а на прыёмачны пункт калгас здае валакно не вышэй 4-6 нумара.

Кулацкае кіраўніцтва калгаса імя Сталіна, Лазовіцкага сельсовета, стала на шлях проста ашуканства дзяржавы — мокрую кастрыцу тут абгрунтавалі добракачэсным валакном. Толькі выпадкова кулацкі манеўр быў выкрыт, але да сёнешняга дня ніхто да адказнасці не прыцягнут. Раённае кіраўніцтва проста патурае кулацкаму сабатажу.

Толькі і толькі гэтым можна тлумачыць, што Клімавіцкі раён па ходу ільназагатовак займае апошняе месца ў рэспубліцы.

На жаль, такое становішча мы маем не толькі па аднаму Клімавіцкаму раёну. Ва Ўваравіцкім, Лельчыцкім, Нараўлянскім і іншых адсталых раёнах наглядаецца такі-ж самы малюнак. Як і ў Клімавічах, галоўнай прычынай адставання тут з'яўляецца прамое патураннe кулацкаму сабатажу.

Значнае месца ў выкананні плана загатовак займае аднаасобны сектар. Між тым гэты важнейшы ўчастак на многіх мясцах пакінут без усякага кіраўніцтва і ўвагі. У Магілёўскім раёне аднаасобнікі павінны выканаць каля 60 проц. раённага плана ільназагатовак. Але, з прычыны таго, што тут аднаасобнікаў скінулі з рахунка, не вядуць сярод іх ніякай работы, раён выканаў свой план усяго на 20 проц. і займае адно з апошніх месц.

Зусім адсутнічае кантроль над выкананнем планаў кулацкімі гаспадаркамі. У Лельчыцкім і Уваравіцкім раёнах кулацкія гаспадаркі выканалі менш двух процантаў свайго задання.

БССР адстае не толькі па колькасных, але і па якасных паказальніках выканання плана загатовак. Замест 8,3 нумара, вызначанага па плану па ільнаводных раёнах, у сярэднім здаваемае валакно не перавышае 7,2 нумара. Асаблівую бязвадзейнасць у барацьбе за якасць ільнавалакна праяўляе ЛЁЗНЕНСКІ раён. Замест 10 нумара тут здаюць 6-м. Гэта з'яўляецца вынікам адсутнасці ўсялякага ўліку якасці прымаемай ад трапальшчыц прадукцыі. Распаўсюджаная ў асобных калгасах кулацкая думка аб тым, што «якасць ільну не залежыць ад трапальшчыцы і таму ўлічваць якасць не трэба» — не сустракае сапраўднага большэвіцкага адпора.

Становішча з ільном у БССР нельга інакш характарызаваць, як ганебнае. Вінаваты ў гэтым, галоўным чынам, кіруючыя партыйныя і совецкія раённыя арганізацыі.

ЗАРАЗ, НАПЯРЭДАДНІ З'ЕЗДАЎ НАШАЙ ПАРТЫІ, ВАЖНЕЙШАЙ ЗАДАЧАЙ ДЛЯ ЎСЕЙ КП(б)Б, З'ЯЎЛЯЕЦЦА ЛІКВІДАЦЫЯ АДСТАВАННЯ ПА ІЛЬНАЗАГАТОЎКАХ. ЗАДАЧА ЗАКЛЮЧАЕЦЦА Ў ТЫМ, КАБ ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ КАНКРЭТНАЕ КІРАЎНІЦТВА ІЛЬНААПРАЦОЎКАЙ, ІЛЬНАЗДАЧАЙ НЕПАСРЭДНА НА ІЛЬНАМЯЛЬНЫМ ПУНКЦЕ, У БРЫГАДЗЕ, У ВЁСЦЫ, У ДЗЕСЯЦІДВОРЦЫ.

Толькі разгромімўшы кулацкі сабатаж, толькі пры правільным кіраўніцтве і ўмелай расстаноўцы сіл партарганізацыі змогуць у бліжэйшыя дні выканаць планы ільназагатовак.

Заклікаем усе калгасы паследваць нашаму прыкладу

Ліст намесніка старшыні калгаса „Нямойта“

Летась у нашым калгасе «Нямойта» (Сенненскі раён) недаацэньвалі лён. Дрэнна за ім даглядалі. Шмат было страт. Ільназагатоўкі зацягнулі да красавіка. Здавалі дзяржаве валакно па 2, 4, 6 нумарах.

Мінулы год нас многаму навучыў. Раённыя арганізацыі больш сталі займацца ільном, канкрэтна сталі кіраваць. У выніку лён стаў сапраўды вядучай культурай, якую ўсе ў калгасе цэняць.

Лён рана пасеялі. Пад лён адвялі лепшую зямлю. Па 2-3 разы палолі. Свячасова перабілі; не давалі на полі застайвацца ў капусах, вазілі ў ёўні, падсушвалі, малацілі і рассцілалі. Сартавалі пры кожным працэсе: спачатку — па даўжыні, потым — па колеру і таўшчыні. Выбарачна і пад'ём са сцеліпч праводзілі. Не дапусцілі страт, няма пералежкі, няма недалежкі — усё падрата свячасова.

Паднялі і пачалі апрацоўваць. Трасту лепшую па плану — па завод, горшую — у ручную пераапрацоўку.

Здалі мы дзяржаве 138 цэнтнераў трасты сярэднім нумарам — 1,5, а валакна 23 цэнтнера, па № № 8-10-12 і 14. Гэта — з горшай трасты, а летась нават лепшая давала толькі № 8.

Добра апрацоўвалі лён спачатку да канца. Ад 15 да 30 жанчын працавала толькі на трапанні. Вось лепшыя з іх — ударніцы: Баркоўская Зенка, Вярбіцкая Алеся, Мяснікова Маня, Дубавец Хадора — заўсёды перавыконвалі норму, натрапвалі 15-16 фунтаў высокай якасці валакна.

Шмат над ільном папрацавала ўдарніца Шынкова Ганна, 60 год. Яна была пазменным звяноводам па ільну. Толькі «ільнаводных» працадзён у яе — 91.

І не памыліліся мы, што такую вялікую ўвагу аддалі ільну. За лён мы ўжо атрымалі 35 цэнтнераў добрага жыта, апроч грошай, і ящчэ атрымаем каля 8 цэнтнераў. Жыта гэта размеркавана сярод тых, хто працаваў на ільне. Вышла пакуль што крыху больш за кілограм на «ільняны» працадзень. Гэта — вялікая падтрымка, трыбаўка да агульнай вагі працадня.

Вось Шынкова Ганна атрымала за работу на ільне 6 пудоў жыта, Вярбіцкія — 13 пудоў, Баркоўскія — 12 пудоў, Дубавец — 8 пуд. і г. д.

Апроч гэтага, калі калгас атрымае астатнія 8 цэнтнераў, яны будуць мець дабаўку. Словам, цяпер кожны калгаснік упэўніўся, як павялічваецца вага працадня тых калгаснікаў, якія добрасумленна працавалі на ільне.

Дасягнутыя нашы поспехі паказваюць, што ў кожным калгасе ёсць усе магчымасці свячасова выканаць планы здачы ільнапрадукцыі высокаякасным валакном і гэтым самым павялічыць вагу працадня калгаснікаў.

Заклікаю ўсе калгасы Сенненшчыны паследваць нашаму прыкладу.

Намеснік старшыні калгаса па ільну САЎКА ШЫНКОЎ.

Калгас «Нямойта», Сенненскі раён.

Кулак і яго агентура беспакарана зрываюць ільназагатоўкі

МАЗЫР. (Ад наш. кар.)

Кіраўнікам Мазырскага раёна пры плося расчаравацца. Яны чакалі, што на папыраным пленуме райкома будуць дасягнуты рапартаў ад сельсоветаў і калгасаў аб поўным выкананні планаў здачы ільнапянкі. Як-жа, яны-ж выносілі шмат па станоў па гэтаму пытанню! Многа ўстанаўлялася тэрмінаў: 20 кастрычніка, і снежня і, нарэшце, апошняя пастанова абвяшчала: «Гонар кожнага сельсавета і калгаса рапартаваць пленуму райкома аб поўным выкананні ільнапеньказагатовак».

Усе гэтыя пастановы аказаліся халастымі спраламі, таму што яны не было падмацаваны большэвіцкай работай на мясцах. Выкананне пастаноў не правяралася і яны ператвараліся ў пустыя дэкларацыі. На справе-ж ільназагатоўкі не арганізаваны і праходзяць самацёкам.

План здачы пянькі ў гэтым калгасе — 8 цэнт., а дагэтуль не перапрацавана і не здана ні аднаго кіло. Не выканана заданне і па ільна валакну.

На апрацоўку ільну выходзяць па 8-10 жанчын з 120 працаздольных. Норма выпрацоўкі зусім малая — 3 кіло.

Адзін за адным выступалі старшыні сельсоветаў, калгасаў, партарганізатары. Змест выступленняў адзін:

— Не выканалі ўзятых абавязацельстваў, не арганізавалі апрацоўку ільну. Не глядзелі за якасцю.

І ні адзін не сказаў, як яны думаюць арганізаваць перапрацоўку і здачу ільну ў бліжэйшыя дні.

Буйнейшыя ільнаводчыя сельсоветы і калгасы ящчэ не прыступілі да ільназагатовак. Вось яны: Дамаславіцкі сельсавет — калгасы «VI з'езд совецкіх», «Новыя холодніцы», «Новыя Дамаславічы» і «Чырвоная Дуброва», Дудзіцкі сельсавет — калгас «Чырвоны Юшкі», Навасёлкоўскі сельсавет — калгасы імя 1 мая, «Авангард». Бабрыйцкі, Капіцкі і Сухавіцкі сельсветы выканалі планы ад 2 да 10 проц.

З «праграмнай» прамовай выступіў на пленуме загадчык агітпасавага аддзела райкома тав. Зданові ч:

— Мы-ж пісалі, мы-ж папярэджвалі...

Вось іменна, таварышы, вы вельмі многа пісалі, выносілі многа пастаноў, але мала рабілі канкрэтнай справы. Вы не заўважалі, што рабіліся ў вас пад носам...

У калгасе «Пяцігодка» (Круковіцкі сельсавет) пад кіраўніцтвам старшыні калгаса Мінчука (член партыі) і брыгадзіра Рашотка, капушні з 10 га разасланы не малочанымі. У выніку пагніло і зерне і траста.

У калгасе імя Сталіна (старшыня Басін, член партыі) брыгадзірам сын высланага кулака, які давёў да таго, што траста перапляжала і часцяка пагніла. У калгасе імя БелАН (старшыня Кулеш, член партыі) запінула 6 га ільну, з-за несвячасовай уборкі. У калгасе «Новыя хаты нікі», Дамаславіцкага сельсавета (старшыня калгаса Саноцёнак, комуніст), увесь лён апшоен на сцеліпчы. У калгасе Сельцы (старшыня Каян, кандыдат партыі) не дасталі лён з мачыльных ям і ён застаўся пад лёдам. Тое самае і ў калгасе імя 12-годдзя Окцябра (Ліпаўскі сельсавет).

Усе гэтыя факты ўскрыты толькі зараз. Кулак і яго агенты з партыйнымі білетамі ў кішэнях пад носам у раённых арганізацый, рабілі беспакарана сваю шкодную справу.

**

Пленум прыняў меры для забеспячэння пералома ў ільназагатоўках, мабілізаваў увесь раённы актыў, які знакіроўваецца ў адсталыя сельсветы да поўнага выканання планаў загатовак ільну і пянькі.

Лён у Мазырыцкім ёсць. Трэба толькі сапраўды па-большэвіцку арганізаваць апрацоўку і здачу яго дзяржаве. Асаблівую ўвагу неабходна аддаць загатоўчай рабоце ў аднаасобным сектары.

Ігнараванне аднаасобніка — прычына зрыва плана

МАГІЛЁЎ.

На 15 снежня план загатовак ільнавалакна па магілёўскаму раёну выкананы ўсяго на 20,4 проц.

Прычыны такога ганебнага адставання крыюцца ў дэмабілізацыйных настроях кіраўнікоў раёна і сельсоветаў, якія, скончыўшы пастаўкі збожжа і бульбы, парашылі «адпачыць», спадзяючыся, што «ільназагатоўкі самі сабой пойдуць».

Возьмем для прыкладу перадавы Чорназемаўскі сельсавет, які падрэнна справіўся з усімі гаспадарча-палітычнымі кампаніямі. Да сягнуўшы гэтых поспехаў, старшыня сельсавета БОШАНАЎ дэмабілізаваўся, «пачыўшы на лаўрах».

Гэта скарысталі кулакі і іх агенты, разгарнулі актыўна сваю шкодніцкую дзейнасць супроць ільназагатовак. У выніку Чорназемаўскі сельсавет на 10 снежня выканаў заданне ўсяго на 6,9 проц.

Кулацкі сабатаж ільназагатовак выяўляецца ў злачынай зацяжцы апрацоўкі ільнатрасты. Асобныя кіраўнікі калгасаў, падпаўшы пад кулацкі ўплыў, адвозяць на ільназаводы несартаваную трасту. За апошні час прывоз ніядобракачэснага валакна прыняў масавы характар і асабліва з Гаранскага, Дашкоўскага, Пальнаўскага, Добрасневіцкага сельсветаў.

Калгас «1-е мая», Добрасневіцкага сельсавета, тры разы прывозіў на ільназавод дрэнна-апрацаванае валакно. І ўсе тры разы быў прымушан вазіці назад, бо на заводзе гэты лён не прымалі. Старшыні калгаса Раманаву не раз указвалі, як трэба апрацоўваць лён.

Пры зусім пездавальняючым агульна-раённым выкананні ільназагатовак, асабліва адстае аднаасобны сектар. Так, калі на 10 снежня калгасы выканалі план на 25,7 проц., аднаасобнікі здалі толькі 10,5 проц. плана.

У пяці сельсветах (Бялевіцкі, Вендаражскі, Гарадзішчанскі, Хрыпялеўскі і Селецкі) аднаасобнікі не здалі ящчэ ні аднаго цэнт. ільну.

Характэрны разважанні старшыні Хрыпялеўскага сельсавета Шабекі:

— Калгасы нашы ўжо выканалі 60 проц. плана. Ну, а з аднаасобнікамі заўсёды паспеем. Абвесцім штурм і ўсё будзе ў парадку.

Поўная бяздзейнасць на працягу года, жаданне штурмаві і рыўкамі выканаць план — адна з асноўных прычын адставання большасці сельсветаў.

Раённыя арганізацыі не павінны забываць, што ўдзельная вага аднаасобнага сектара ў ільназагатоўчым плане складае звыш 60 проц. Гэтаму ўчастку неабходна аддаваць асаблівую ўвагу. **Г. К--ль.**

Нарсуддзя Ігнацьеў аддан пад суд

Наркамюстам Беларусі знят з работы і аддан пад суд нарсуддзя Горацкага раёна Ігнацьеў за незабеспячэнне барацьбы з кулакамі, сабатуючымі ільназагатоўкі, і за марыхаванне на працягу 25 дзён пяці кулацкіх спраў — Грыгор'ева, Данілеўскага і іншых — па абвінавачаню ў чвякаванні ільназагатовак.

Пракурорам: Горацкага раёна тав. Дымману і Суразскага тав. Яціновічу за незабеспячэнне барацьбы па выкананню планаў ільназагатовак аб вешчана вымова. (БЕЛТА).

ЛІКВІДАВАЦЬ ПРАСТОІ ВАГОНАЎ!

Максімальна ўвязаць работу леспрамгасаў і пагрузачных станцый

Асноўнымі ўчасткамі пагрузкі дроў для Менска зараз з'яўляюцца асіпавіцкі і бабруйскі леспрамгасы. У дадатак да вагонаў, вызначаных паводле плана, гэтыя леспрамгасы будуць зараз амаль штодзённа атрымліваць для пагрузкі даве «вяртушкі» баласных вагонаў. Толькі на гэтых участках павінна грузіцца штодзённа 110-120 вагонаў. Зразумела, што нармальную работу можа забяспечыць толькі максімальная ўвязка дзеянняў леспрамгасаў і пагрузачных станцый. Між тым, факты сігналізуюць, што бабруйскі леспрамгас і чыгуначная адміністрацыя пагрузачных станцый яго раёна ящчэ не перабудаваліся так, як гэтага патрабуе павялічанне пагрузачных аперацый. Эшалон у колькасці 36 вагонаў, паданы 17 снежня ў 20 г. 20 мін. на ст. Брожа, прастаяў 11 г. 40 мін., г. зн. да 8 гадзін раніцы 18 снежня. 18 снежня эшалон у колькасці 35 вагонаў, паданы на ст. Мошны ў 17 г. 2 мін., прастаяў цэлых 15 гадзін да раніцы 19 снежня.

Мы ящчэ не ведаем вінаватых у такіх злачынных адносінах да баявога задання партыі аб тэрміновым забеспячэнні рабочых Менска палівам. Паводле тэлеграм работніка ўпаўнаваркамшляха тав. Фельдман у прастоях вагонаў вінаваты выключна на работнікі леспрамгасаў — у першым выпадку загадчык складам ст. Брожа (бабруйскі леспрамгас) тав. Дэнцік, які быццам адмовіўся грузіць ноччу і распусціў рабочых; у другім выпадку — агент пагрузкага леспрамгаса Горахаў, які быццам таксама адмовіўся грузіць ноччу. Паводле-ж тэлеграмы бабруйскага леспрамгаса вінавата чыгуначная адміністрацыя, якая, замест 16 гадзін падала вагоны ў 20 г. 20 мін. не на перагон, згодна патрабавання леспрамгаса, а на ст. Брожа. Такім чынам, паводле тлумачэння бабруйскага леспрамгаса выходзіць, што рабочыя чакалі на перагоне падачы вагонаў 19 гадзін, а вагоны тым часам чакалі рабочых на ст. Брожа.

Факты такіх значных прастояў цэлых эшалонаў сігналізуюць аб абсалютнай адсутнасці ўвязкі ў рабоце паміж супрацоўнікамі леспрамгасаў і работнікамі пагрузачных станцый. Неабходна каб з боку ўпаўнаваркамлеса і ўпаўнаваркамшляха былі прыняты энергічныя меры для поўнай ліквідацыі гэтай яўвязкі.

Гэта датычыць не толькі пагрузачных станцый, але і станцый разгрузкі. Па надбайнасці начальніка ст. Менск тав. Фрапова другая «вяртушка», якая ўчора прыбыла ў Менск, была разбіта на пяць частак — у адшаведнасці адрасоў атрымалі нікаў — і прастаяла ў мясцах разгрузкі пішніх 8-9 гадзін. Праўда, у гэтым прастоі вінават таксама бабруйскі леспрамгас, які чамусці палічыў патрэбным пагрузіць адну «вяртушку» па 7 розных адрасах — замест аднаго гартопа.

Пагрузачныя станцыі і станцыі разгрузкі павінны працаваць як гадзіннік. Няўпасць двух «вяргушак» дае поўную магчымасць наладзіць бесперапыннае снабжэнне пролетарыяў Менска палівам. Ні адной мінуты прастоя вагонаў як на станцыях пагрузкі, так і ў мясцах разгрузкі — вось баявая задача, за якую павінны зараз па-большэвіцку змагацца работнікі леспрамгасаў і чыгуначнікі.

**

Ні аднаго вагона пад пагрузку дроў для Менска не даў гомельскі эксплаатацыйны раён. Да рэчы, Гомельскі раён у асобе начальніка раёна тав. Дзімускова ўпарта не выконвае плана перавозкі дроў Менску, не гледзячы на шматлікія распараджэнні ўпаўнаваркамшляха і кіраўніцтва Заходняй дарогі. Калі мы гаворым, што план завоза дроў Менску за 1-ю дэкаду снежня не выканан на 154 вагоны, то гэта адносіцца выключна за кошт Гомельскага раёна. Замест 330 вагонаў паводле снежаньскага плана, Гомельскі раён за 2 дэкады падаў для пагрузкі дроў Менску толькі 86 вагонаў (14 снежня — 42 і 16 снежня — 44). На тав. Дзімускова не падзейнічала нават распараджэнне Заходняга раённага кіраўніцтва НКПС па планаванню і рэгуляванню (Смаленск), якое дало тры дні для ліквідацыі прарыва.

Камандыраваная ўчора ў Гомель упаўнаваркамшляхам тав. Фельдман павінна рапуча пастаўіць перад тав. Дзімусковым пытанне аб ліквідацыі прарыва, у працёўным выпадку перадаць справу аб яго сабатажы ў гомельскую гарКК для прыцягнення яго да суровай партыйнай адказнасці.

**

Узмацненне падвозу дроў за апошнія дні дало ўчора магчымасць гартопу выдаць рабочым 471 шурку дроў. Гэта рэкордная лічба за доўгі час. Наступ за другую дэкаду выдана пайшчыкам на 112 проц. больш дроў, чым за першую дэкаду (2.426 шурак, замест 1.144 шурак).

Аднак, у параўнанні з патрэбнасцямі рабочага насельніцтва Менска, гэта толькі першы крок. Гартоп павінен прыняць усе меры да значнага павялічэння штодзённай выдачы дроў пайшчыкам.

**

Заданне ЦК КП(б)Б аб вывазцы да 20 снежня 7.500 кбм. дроў гужам на сённешні дзень выканана толькі на 33 проц. — вывезена 2.475 кбм. Праўда, з кожным днём колькасць падвод павялічваецца. Калі 19-га было 648 фурманак, то ўчора прыбыло ў Менск 825 фурманак.

Але зрыў выканання баявога задання ЦК КП(б)Б сведчыць аб далёка недастатковых тэмпах у справе мабілізацыі фурманак на падвозку дроў Менску. Трэба сказаць, што Менгарсавет не праявіў дастатковай энергіі ў справе мабілізацыі фурманак Менскага раёна. Аб нядбайных адносінах да гэтага важнейшага задання з боку пасобных работнікаў гарсавета сведчыць наступны факт. Самахвалавіцкі і Сенніцкі сельсветы атрымалі ад гарсавета тэлефанаграму аб накіраванні абозаў за дровамі ў Смілавічы, у Грабенскую дачу. Але замест Смілавіч абозы накіраваліся ў Сматлявічы. Хто пераблытаў тэлефанаграму — ящчэ невядома. Абозы пасля таго, як прайшлі вялікую адлегласць, прымушаны былі звярнуцца назад.

Менскі гарсавет павінен больш актыўна ўключыцца ў справу забеспячэння Менска палівам. Заданне партыі аб вывазцы гужам 7.500 кбм. дроў павінна быць выканана ў бліжэйшыя-ж дні.

Зламаць кулацкі сабатаж

Кампанія загатовак ільну і пянькі, ільнасеяння і канапель праходзіць у Шклоўскім раёне на аснове шырока разгорнутай масава-палітычнай растлумачальнай работы. На гэтай аснове партыйная арганізацыя Шклоўшчыны дабілася пералому і значных результатаў у выкананні планавых заданняў. На гэтай аснове неабходна ў бліжэйшую 5-тыдзённку ў асноўным завяршыць выкананне плана.

Дзесяткі калгасаў, сотні аднаасобных гаспадарак выканалі і перавыканалі план, прадаўжаючы спаборніцтва і барацьбу за першае месца на раённай чырвонай дошцы.

Неабходна і надалей праводзіць гэту важнейшую кампанію на аснове масава-палітычнай работы па арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаванню калгасаў, узняцію працоўнай дысцыпліны і мабілізацыі творчага энтузіязма калгаснікаў.

Аднак трэба памятаць, што ільна загатоўкі працякаюць на ўмовах жорсткай класавай барацьбы і правільна, па-большэвіцку спалучаць масава-палітычную работу з адміністрацыйнымі рашучымі мерамі супроць кулацкіх сабатажнікаў, якія вядуць контр-рэвалюцыйную работу.

Класавы вораг — кулак і яго агентура ўзмоцнена дзейнічае ў радзе сельсоветаў Шклоўшчыны і сярод калгаснікаў, і сярод аднаасобнікаў, развіваючы шалёную контр-рэвалюцыйную агітацыю, накіраваную на зрыў ільназагатовак.

Класавы вораг прабуе скарыстаць нязжытыя ящчэ поўнасцю дробнаўласніцкія інстынкты адсталай часткі калгаснікаў і ў асаблівасці калгаснік, дэзарганізуе апрацоўку і здачу ільнавалакна дзяржаве. Нярэдка класавы вораг даходзіць да крайняй нахабнасці. Так, у вёсцы Путнікі, Гарадзецкага сельсавета, заможнік Гапонаў Сцяпан, які мае 8 га раллі, беспакарана вядзе сярод аднаасобнікаў контр-рэвалюцыйную агітацыю, заклікае іх не здаваць ні фунта ільну дзяржаве. Не здаўшы ні фунта ільнавалакна дзяржаве, кулак Гапонаў дэманстратыўна пакрыў дах ільном.

Разам з Гапонавым вядуць контр-рэвалюцыйную работу па сабатажу ільназагатовак і інш. заможнікі, як Маслабойчык Нікіта, Пантапошка Ганна, Матяшкаў Міхась і інш.

У выніку кулацкай агітацыі і адсутнасці масавай растлумачальнай работы аднаасобнікі вёскі Гарадзец ящчэ не здалі дзяржаве 50 цэнтнераў.

У вёсцы «Захадзь» Гарадзецкага сельсавета, з 70 аднаасобных гаспадарак толькі 18 часткова выканалі свае абавязацельствы, астатнія-ж 52 гаспадаркі ящчэ не здалі ні фунта ільнавалакна. Тут арудуе 10 злосных кулацкіх сабатажнікаў, якія і ў мінулым не раз прыцягваліся к суду за зрыў загатовак.

У сельсавеце Падгайцы з 430 аднаасобных гаспадарак толькі адзінаццаць выканалі свае абавязацельствы. План па здачы ільнавалакна ў цэлым па сельсавету выканан на 14,7 проц.

Аднак, злосны кулацкі сабатаж ільназагатовак не абмяжоўваецца ад назособным сектарам. Кулацкія сабатажнікі вядуць сваю шкодніцкую работу за зрыў плана ільназагатовак і ў калгасах. Напрыклад, у калгасе «Барацьба». Падгайцаўскага сельсавета, звілі сабе цёплае гняздо класавыя ворагі: нам. старшыні праўлення калгаса (ён-жа адказны за выкананне плана ільназагатовак) і брыгадзір Гарбузоў Сцяпан, якія вядуць работу на поўны развал калгаса. Яны прывялі да поўнага зрыва пра поўнай дысцыпліны, заведама дэзарганізуюць сушку, мяцьцё, трапанне і шаотуп ручную апрацоўку ільнавалакна, увялі поўную ўраўнілаўку і абязлічку. Іх злачынную кулацкую дзейнасць пакрывае старшыня праўлення калгаса кандыдат КП(б)Б тав. Кудзепеў, які не размяркоўвае ні прамтавараў, ні хлеба сярод ударнікаў і ўдарніц, працуючых па ільну.

Шчэрбакоў і Гарбузоў настолькі абнаглелі, што прабуюць зрываць усе мерапрыемствы брыгадзіра 2-ой брыгады Гартаева і ініцыятыву саміх калгаснік. За выключэннем брыгады Гартаева ні адна брыгада да апошніх дзён не здала ні аднаго цэнтнера валакна. У апошнюю пяцідзённку ільнапрацоўка поўнасцю сарвана шкодніцкай работай Шчэрбакова і Гарбузова.

Усе гэтыя прыведзеныя факты, выкрытыя пры абследзе рада сельсветаў Шклоўскага раёна, указваюць на абвостраную класавую барацьбу вакол ільназагатовак.

Неадкладнай задачай сельсветаў з'яўляецца пакласці канец контр-рэвалюцыйнай рабоце класавага ворага, нанесці сакрушальны ўдар па кулацкіх сабатажніках, на аснове

ПАРТЫЙНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ БССР АДКАЗВАЮЦЬ НА ПАСТАНОВЫ ПЛЕНУМА ЦК КП(б)Б КАНКРЭТНЫМІ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАМІ І ЎЗДЫМАМ АКТЫЎНАСЦІ ПАРТЫЙНЫХ І БЕСПАРТЫЙНЫХ МАС

ПАСТАНОВЫ ПЛЕНУМА ЦК АБАВЯЗАЛІСЯ РЭАЛІЗАВАЦЬ З БОЛЬШЭВІЦКАЙ НАСТОЙЛІВАСЦЮ

ВІЦЕБСК. (Наш кар.). 16 снежня па ўсіх фабрыках, заводах і навучальных установах горада адбыўся абмен партдзень, прысвечаны прапрацоўцы рашэнняў пленумаў ЦК і КП(б)У.

З вялікай актыўнасцю прайшоў сход партарганізацыі фабрыкі «Знамя індустрыялізацыі», на якім прысутнічала 260 комуністаў і комсамольцаў.

Дакладчык — сакратар гаркома партыі тав. ЖУРАЎЛЕЎ,—завастрыў увагу на неабходнасці рашучай барацьбы з мясцовым шавінізмам — галоўнай небяспекай ва ўмовах БССР, не аслабляючы разам з гэтым барацьбы з вялікадзяржаўным шавінізмам. Сход поўнасцю ўхваліў пастанову пленума ЦК КП(б)Б.

Партарганізацыя «Дзвіны» тэкса ма поўнасцю ўхваліла рашэнні пленума і ў адказ на гэтыя рашэнні паставіла перад сабой баявую задачу — змагацца, як належыць большэвікам, за лозунг: «Наша праца павінна быць самай лепшай якасці».

Актыўна прайшоў партсход і на заводзе сельгасмашынабудаўніцтва «Чырвоны металіст», дзе прысутнічала па 230 комуністаў і комсамольцаў.

Сход, аднадушна вітаючы рашэнні пленума ЦК КП(б)Б, падкрэсліў неабходнасць мабілізацыі ўсяго партактыва і ўсёй масы рабочых завода на рэалізацыю рашэнняў пленума.

Агульны сход прапанаваў бюро парткалектыва зазірнуць асаблівую ўвагу на сістематычную і глыбокую праверку выканання ўказанняў камісіі па чыстцы партыі, што павінна забяспечыць высокі палітычны ўзровень кампаніі перавыбараў парт органаў.

На шчацінна-шчотачным камбінаце з дакладам аб рашэннях пленумаў ЦК і гаркома выступіў старшыня гарКК-РСІ тав. АВЕРЫН. Выступаўшыя ў спрэчках таварышы на канкрэтных фактах і прыкладах да казвалі недапушчальна-слабую работу партарганізацыі ў барацьбе за правядзенне ленінскай нацыянальнай палітыкі. Напрыклад, меўшая месца на камбінаце вылазка вялікадзяржаўнай шавіністкі Фіпатавай не атрымала своечасова належнага адпора з боку партыйнай арганізацыі. Выступіўшы рабочы Цыльман падкрэсліў зусім слабую выхаваўчую работу парткалектыва і ячэек спрод рабочых нацыянальнасцяй. Сход поўнасцю ўхваліў рашэнні пленума ЦК, комуністы і комсамольцы абавязаліся па-большэвіцку гэтыя рашэнні рэалізаваць.

Асаблівай увагі заслугоўвае прайшоўшы партсход на вугткевай фабрыцы імя Гірша Лекерта. Як вядома, чыстка партарганізацыі фабрыкі ўскрыла гнязда нацыяналістаў, асабліва бундаўцаў. І на гэтым сходзе член партыі Панкратаў, наперакор рашэнням пленума ЦК КП(б)Б даказваў, што ва ўмовах фабрыкі імя Лекерта галоўнай небяспекай застаецца паранейшому вялікадзяржаўны рускі шавінізм.

Гэта «таорыя» асаблівых небяспек для кожнай фабрыкі атрымала з боку ўсяго схода рашучы адпор. Сход цалкам і поўнасцю ўхваліў рашэнні пленума ЦК КП(б)Б, абавязаўся прыкладзі ўсе сілы да кваліфікаванай рэалізацыі гэтых важнейшых рашэнняў.

У процівагу ўсім гэтым актыўна прайшоўшым сходам, сход партячэйкі ЦРК быў прасякнут наскрозь апілуйшчыкай і дэкларацыйнасцю, замаскіўшых сабой большэвіцкую крытыку і семакрытыку. Яшчэ да адкрыцця схода нам. старшыні ВЦРК, член партыі Кіспін заяўляў, што ў ЦРК, моў усё спакойна, у апараце, моў, няма нацыяналістаў і г. д. У часе спрэчак ні адзін з прысутных на сходзе былых бундаўцаў (Глазман, Гельфер і інш.) не палічылі патрэбным падкрэсліць, што барацьба супроць мясцовага беларускага нацыяналізма — галоўнай небяспекі ў БССР на гэтым этапе—ні ў якім выпадку не павінна аслабіць барацьбу з рэшткамі бундізма, вялікарускім і інш. шавінізмамі. Між тым іменна ў апараце ЦРК меў месца рад скажэнняў у практыцы правядзення ленінскай нацыянальнасці.

На сходзе партарганізацыі фабрыкі «КІМ» была ўскрыта нацыянал стычная, контр-рэвалюцыйная дзейнасць прапешкага на фабрыку пад маскай рабочага класавага ворага. Так, на гэтай фабрыцы з боку «работніцы»-беларускі Ходзікавай, заг. страхпунктам Амусіной пры падтрымцы старшыні фабкома ВАЙНШТЭЙН падпадала ганенню і агідным здзекам працуючая на фабрыцы цыганка тав. Рачкоўская.

Выступаўшыя таварышы зусім правільна ацэнілі і асудзілі гэты і другія падобныя факты. Сход вітаў рашэнні пленума ЦК КП(б)Б.

На партсходзе ў педагагічным інстытуце выступаўшыя таварышы таксама падкрэслівалі адсутнасць у рада комуністаў класавай пільнасці. Толькі гэтым можна тлумачыць нацыянал-дэмакратычную вылазку настаўніцы Гаранінай, выкладаўшай студэнтам беларускую мову па Лісіку.

Сход парт'ячэйкі педінстытута і іншых навучальных устаноў прыняў рэзалюцыі, у якіх вітаюць рашэнні пленума ЦК і гаркома КП(б)Б і поўнасцю да іх далучаюцца.

АРК. ЗАРУБЕЖНЫ.

ЗА ВЫСОКУЮ РЭВОЛЮЦЫЙНУЮ ПІЛЬНАСЦЬ

МАЗЫР. (Ад нашага кар.). 8-10 снежня адбыўся шапыраны пленум Мазырскага райкома КП(б)Б разам з партактывам.

Пленум разглядзеў пытанні аб ільназагатоўках, аб становішчы жывёлагадоўлі і задачах перавыбараў парторганаў. З прамовай аб выніках снежаньскага пленума ЦК КП(б)Б і лістападаўскага аб'яднанага пленума ЦК і ЦКК КП(б)У выступіў сакратар райкома тав. Клімчук.

У прынятай пастанове аб задачах перавыбараў парторганаў пленум запісаў:

— «Пленум РК КП(б)Б цалкам і поўнасцю адобрае і далучаецца да рашэнняў снежаньскага пленума ЦК КП(б)Б, якія даюць большэвіцкі аналіз становішча нашай краіны і барацьбы КП(б)Б за ленінскую нацыянальную палітыку. Пленум намеціў большэвіцкую праграму падрыхтоўкі партыйнай арганізацыі да XVII з'езда ВКП(б) і XV з'езда КП(б)Б, намеціў задачы барацьбы за ленінскую нацыянальную палітыку на сучасным этапе».

У апошні час у Мазырыцкае ўскрыты факты актывізацыі нацыяналістычных элементаў (Савіцкі сельсавет, Прудкаўская і Авярыцкая школы, Калінкавіцкая беларуская і яўрэйская семігодкі, у Мазыры I, II, III і IV школы і інш.).

Пленум адзначыў, што ўсе гэтыя выступленні «з усёй відавочнасцю паказваюць на яшчэ зусім недастатковую большэвіцкую пільнасць раённай партыйнай арганізацыі, асабліва ў галіне інтэрнацыянальна-выхаваўчай работы і нацыянальна-культурнага будаўніцтва».

Пленум патрабаваў ад усёй партыйнай арганізацыі, ад кожнага члена і кандыдата партыі ўпартай барацьбой за ленінскую нацыянальную палітыку, супроць мясцовага нацыяналізма, як галоўнай небяспекі ў БССР на даным этапе, супроць вялікадзяржаўнікаў і г. д. ўзмацненнем класавай пільнасці забяспечыць далейшы рост культуры нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зместу.

Пленум прапанаваў усім партарганізацыям зараз-жа прапагандаваць рашэнне снежаньскага пленума ЦК КП(б)Б на адчыненых парт сходах, з прыцягненнем шырокіх беспартыйных мас. У раёне праведзена адзіны партдзень па распрацоўцы і рэалізацыі рашэнняў снежаньскага пленума ЦК КП(б)Б.

Пленум намеціў мерапрыемствы ў сувязі з перавыбарамі парторганаў і падрыхтоўкай да XVII з'езда ВКП(б) і XV з'езда КП(б)Б.

Правядзенне падрыхтоўчай работы да перавыбараў парторганаў шчыльна ўвязваецца в выкананнем усіх гаспадарча-палітычных задач, у раёне разгорнута ўсмоцненая барацьба за скачэнне ссыпкі насенных і страхавых фондаў, за скачэнне перапрацоўкі і здачы ільна-пяньканрадукцыі дзяржаве, за поспех лесавывазак, за скачэнне надзялення бескароўных калгаснікаў цёлкамі.

Ул. Начальскі.

Ухвалілі пастановы пленума ЦК

ПОЛАЦАК. (Ад нашага кар.). Аб'яднаны пленум РК і РКК сумесна з сакратарамі калгасных і гарадскіх ячэек, сумесна з парторгамі і актывам гарадской арганізацыі заслухаў даклад тав. Турлая аб выніках снежаньскага пленума ЦК КП(б)Б.

Удзельнікі пленума ў сваіх выступленнях падкрэслілі палітычнае значэнне пастановы пленума ЦК па пашытанню.

Начальнік палітаддзела Ветрынскай МТС тав. Плоткін у сваёй прамове спыніўся на антысавецкай работе групы шпіёнаў-нацдэмаў у Ветрынскай МТС. Тут на працягу 10 год у якасці агранома працаваў нехта Рубека. Гэты «аграном» чыўся нават адным з лепшых у раёне. А палітаддзел, калі добра ўгледзеўся ў работу Рубека, выявіў, што ён на працягу доўгага часу праводзіў яўна шкодніцкія справы.

Начальнік палітаддзела Полацкай МТС тав. Берзін таксама прывёў рад характэрных фактаў шкодніцтва. Каб скампраметаваць мерапрыемствы партыі і ўрада, шкоднікі так паставілі справу з надзяленнем калгаснікаў цёлкамі, што гэтыя цёлкі выдаваліся старукам на 75 год, або халасцякам, якія потым іх прадавалі.

У сваёй пастанове аб'яднаны пленум Полацкага РК і РКК ухваліў рашэнне пленума ЦК па нацыянальнаму пытанню. Пленум даручыў бюро раённага камітэта распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы па ажыццяўленню рашэнняў снежаньскага пленума ЦК.

Н. Нэйдлін.

Узяты канкрэтныя абавязацельствы

Далейшы падбор і далейшае выхаванне радыёкадраў (наштшталт балалаечніка Струнеўскага, ксілафаніста Яўна і інш.) павінна быць узнята і самім радыёкамітэтам на прынцыповую вышыню. Якасць вяшчання з Менска павінна палепшацца. Гэта яшчэ больш датычыць раёна, дзе радыёвяшчанне часта ў палоне халтуры. А становішча ў раёнах такім будзе заставацца да таго часу, пакуль райкомы партыі не падыйдуць бліжэй да кіраўніцтва радыёсправай.

* * *

У значнай ступені справу выратуе сувязь з масамі, прыцягненне мас. Працоўны слухач павінен быць і крытыкам. Нам шмат чым дапамагаюць колны дзень зараз атрымліваемыя лісты ад слухачоў, іх ацэнка, іх жаданні, іх заказы. Сумесная работа ўсебеларускага радыёкамітэта і радыёвузлоў з слухачамі і радыёаматарамі—вось асноўны шлях да таго, каб вывесці радыёвяшчанне на шырокую дарогу.

Актывізаваць сваю работу па радыёфікацыі і радыёвяшчанню павінен і комсамол Беларусі. Яму і яго комсамольскім радыёкамітэтам належыць вялікае месца ў барацьбе за арганізацыю партыйнага штодзённага мітынга мільёнаў.

Г. Фалкін.

Парушэнні канвенцыйных цэн—дзяржаўнае злачынства

Па БССР у 1933 годзе трэба загатовіць у пазапланавым парадку сельгаспрадуктаў на (акрамя абоскжавых) на 87 мільёнаў рублёў.

Правільнае развіццё дэцэнтралізаваных загатовак, на аснове двухбаковых дагавораў, з'яўляецца адным з магутных вагароў сацыялістычнага перавыхавання калгасніка.

Адсюль зразумела якое вялікае значэнне мае барацьба за захаванне совецкай палітыкі цэн. Іменна на гэтым участку класавы вораг аказвае асабліва ўпартае супраціўленне, сіліцца распальваць рвацкія спекуляцыйныя тэндэнцыі ў калгасах, сарваць устаноўленыя канвенцыі.

Правыя апартуністы, з іх ліберальна-буржуазным тлумачэннем задач совецкага гандля, прапаведваючыя раўнанне на рынкавую стыхію, і «левакі», з іх антыпартыйнай недаацэнкай совецкай палітыкі цэн, фактычна дапамагаюць класава-варожым элементам.

Хто кіруе ўстанаўленнем канвенцыйных цэн, хто рэгулюе адзінства дзеянняў загатоўчых арганізацый? Гэту адказную работу павінны праводзіць **канвенцыйныя бюро**, створаныя пры камітэце загатовак і пры райвыканкомах на мясцах.

Артыкул «Правды» ад 17 верасня «Аб канвенцыйных бюро, якіх няма» сігналізаваў аб наяўнасці буржуазна-спекуляцыйных тэндэнцый і парушэннях канвенцыйных цэн у дэцэнтралізаваных загатоўках.

З таго часу становішча мала палепшылася. Аб гэтым сведчаць матэрыялы праверкі работы канвенцыйных бюро, праведзенай інспекцыяй цэн пры НК-РСІ БССР. Канвенцыйныя бюро ў большасці раёнаў БССР усё яшчэ працуюць вельмі дрэнна. Яны не змагаюцца за далейшае зніжэнне цэн і аздараўленне рынка. Яны вельмі слаба рэагуюць па ажыятаж і спекуляцыйныя тэндэнцыі з боку паасобных загатоўчых арганізацый, на сістэматычную закупку прадуктаў па рынкавых цэнах.

Можна прывесці рад прыкладаў гэтаму.

ЗРК будаўнікоў (старшыня **БЛЮМБЕРГ**) толькі за першае паўгоддзе 1933 года па мяса-малочных прадуктах пераплаціў 23.000 рублёў. Ён загатовіў сала на 10.000 рублёў і плаціў па 10-12 руб. за кіло, замест 8 р. 46 к. Ён закупіў яйкі ў менскай інкубатарнай станцыі і плаціў па 4 руб. за дзесятак, замест 2.

ЗРК фабрыкі імя Крупскай (старшыня **ЛІС**) загатовіў мясапрадуктаў на 51.000 рублёў, плаціў ва валоўе мяса па 7-8 руб. за кіло, замест устаноўленых 2 р. 50 к.

ЗРК сувязі загатовіў мясапрадукты па дзесяткі рублёў па спекуляцыйных цэнах.

ЗРК фабрыкі «Кастрычнік» закупіў у жыткавіцкага райзага 8 кароў і плаціў за 1 кіло жывой вагі на 3 р., замест устаноўленых 1 р. 22 к. Гэты-ж ЗРК толькі ва адзін квартал пераплаціў 14.000 рублёў.

ЗРК фабрыкі «Комунарка» закупіў у калгасе «Агароднае аб'яднанне» 2.370 кіло капусты па цане 30 к. за кіло, замест канвенцыйнай цаны ў 9 к.

Якія толькі хітрыкі і маніпуляцыі не ўжываюць загатоўшчыкі, каб абыйсці канвенцыйныя цэны, каб утаіць спекуляцыйныя здзелкі. Звычайна яны ў рахунках зусім не вызначаюць вагу або колькасць загатоўленых прадуктаў і тым самым утойваюць факты скажэння совецкай палітыкі цэн.

МГРК закупіў жывёлу на суму ў 96.000 рублёў без указання вагі. За адну карову плаціл па 1.000--1.500 руб., што ў некалькі разоў перавышае канвенцыйныя цэны.

ЗРК сувязі ўплаціў 750 рублёў за карову, купленую ў Жлобінскім раёне, а за дастаўку ўключыў у рахунак 450 рублёў.

Мы тут маем справу з простым супраціўленнем класава-варожых элементаў палітыцы цэн, з імкненнем розными шляхамі абыйсці асноўныя прынцыпы совецкага гандля.

Часта кіруючыя работнікі ЗРК і райзагаў тлумачаць парушэнне канвенцыйных цэн тым, што цэны на рынку высокія і таму немагчыма загатаўляць сельскагаспадарчую прадукцыю на аснове канвенцыі. Такія разважанні — ёсць вынік націска на некаторых няўстойлівых членаў партыі кулацкай, дробна-буржуазнай стыхіі.

Менскае канвенцыйнае бюро пасля пастановы менгаркома КП(б)Б не перабудавала сваёй работы. Яно сваёй бяздзейнасцю дае поўную магчымасць розным спекулянтам парушаць канвенцыйныя цэны. Гандлюючыя арганізацыі Менска не могуць своячасова атрымаць у канвенцыйным бюро даведкі аб іменах цэн. Старшыня ЗРК завода імя Молатава тав. **Налівайка** ніяк не мог атрымаць у канвенцыйным бюро цэн на пітушку, бо канвенцыйнае бюро само іх не ведае.

Такое становішча сведчыць так сама аб вельмі слабай рабоце рэспубліканскага канвенцыйнага бюро пры кам. заг. СНК.

У радзе раёнаў (Менск, Віцебск, Мазыр) намеснікі старшынь гарсоветаў па загатоўках і канвенцбюро не ведаюць сваіх абавязкаў; яны абмяжоўваюцца выключна на кладанням штрафаў, не цікавяцца арганізацыяй загатовак, не змагаюцца з ажыятажам па рынку. Яны не вывучаюць эканомікі свайго раёна, мала дапамагаюць ачышчэнню загатоўчага апарата ад чужых, спекуляцкіх элементаў.

ЦК КП(б)Б і СНК БССР абавязалі райкомы і райКК прымаць самыя суровыя меры, аж да выключэння з партыі, у адносінах асоб, вінаватых у павышэнні загатоўчых цэн. Партыя і ўрад прапанавалі разглядаць тавараабменныя аперацыі і парушэнні канвенцыі як грубейшае скажэнне лініі партыі, як праяўленне буржуазна-нэпманскіх тэндэнцый. Гэта пастанова павінна быць поўнасцю ажыццёўлена.

А. ШАЎРОЎ і Б. ГЕЛЬФМАН.

ДА 15 З'ЕЗДА КП(б)Б і 17 З'ЕЗДА ВКП(б) ДАБІЦЦА ВЫСОКІХ ПАКАЗАЛЬНІКАЎ ПА АЗДАРАЎЛЕННЮ ВАГОННАЙ ГАСПАДАРКІ

На [illegible] ных [illegible] пуцях Арш[illegible]ка вагоннага дэпо стаяць абт[illegible] хворых вагонаў. Цэлымі саставамі яны стаяцяюцца тут і чакаюць рамонта. Здаецца, здаецца, што калі гэтых вагонаў ісціць ударная праца па іх аздараўленню. Падыходзім бліжэй. Хворыя вагоны з паламанымі лазамі, з сапсаванымі буксамі, рэсорамі і буферамі, застылы шы стаяць і туляцца адзін да аднаго. Кальцом акружылі яны вялізныя прасторныя карпусы дэпо, пабудаванага год таму назад. Марудна ідзе рамонт. Кожны дзень на рэйках застаюцца дзесяткі і сотні вагонаў.

Начальнік дэпо Одынец, сакратар парт'ячэйкі Дземіцаў самадавольна растлумачваюць:

— Раней у нас справы былі горш, а да кастрычніцкіх свят мы падцягнуліся...

Каб падмацаваць гэтую агульную думку, яны карыстаюцца спакусліваю статыстыкай. Нач. тэхбюро дэпо **Коцар** — галоўны выканаўца гэтай статыстыкі.

— Згодна задання ў нас кожны дзень можа заставацца 25 хворых вагонаў, а ў лістападзе мы нават мелі задзенне па астачы — 45.

Гэта першае тлумачэнне. Другое — гэта арыфметычнае сярэдняе. Бярэцца астача хворых вагонаў за месяц, дзеліцца на 30 дзён і атрымліваецца жаданае сярэдняе. Па іх статыстыцы астача хворых вагонаў у лістападзе замест 45 па заданню складае 33.

І, нарэшце, трэцяя статыстычная дапелка. Дэпо мела задзенне выпускаць з капітальнага рамонта у кастрычніку 20 вагонаў, а выпусціла 43.

З першага погляду, калі верыць гэтым лічбам, дык не так ужо дрэнна стаіць справа.

Але гэтая «статыстыка» ёсць простае «очковтирательство», замазванне сапраўднага становішча ў дэпо. Праверка нас у гэтым пераканала. Фактычна ў лістападзе кожны дзень застаўлася нерамантаваных не 33, а па 85, 90 і нават 100 вагонаў.

Яшчэ горш у снежні. Пры заданні ў 25 кожны дзень застаецца па 105, 123 і нават даходзіць да 150 нерамантаваных вагонаў. Ад гэтых лічбаў, калі вывесці сярэднюю, дык кожны дзень астача хворых вагонаў складае не менш 90 адзінак.

Сістэматычна не выконваецца і праграма капітальнага рамонта. Праграма па капітальнаму ў першым квартале выканана на 54,6 проц., у 2-м — на 78,5 проц., у 3-м — 83,6 проц. і зусім дрэнна ў 4-м квартале. Нават пры паменшаным заданні праграма не выконваецца. У кастрычніку замест 50 адрамантавалі 39 вагонаў. У лістападзе замест 20 адрамантавалі 18.

Так выглядае сапраўднае становішча з рамонтам вагонаў.

Пасля гэтага проста здзіўляе, як людзі накшталт начальніка дэпо Одынца і сакратара парт'ячэйкі Дземіцава, пастаўленых партыяй на адказным участку, могуць спакойна заяўляць, што работа дэпо ідзе ўгару. Хіба гэта не ёсць просты сабатаж пастаноў партыі і ўрада аб аздараўленні вагоннай гаспадаркі?

Як-жа з якасцю рамонта ў дэпо? У гэтых адносінах ёсць простае шкодніцтва. За лістапад са зданых абменным пунктам Орша-Заходняя на заходнюю чыгунку 25857 вагонаў — 25293 мелі розныя няспраўнасці на суму 1.788.350 руб. Абменны пункт Орша-Усходняя са зданых у лістападзе на МББ чыг. 26.653 вагонаў — 25.671 з рознымі дэфектамі на суму 1.454.384 руб.

Можна прывесці рад абураючых фактаў нізкай якасці рамонта.

12 снежня да пятніка № 773 былі прычэплены 20 адрамантаваных вагонаў, вышаўшых з дэпо. На станцыі Орша-Заходняя (калі цягнік пройшоў усяго 1 клм.) 13 вагонаў былі забракаваны і накіраваны на паўторны рамонт.

Аб дрэннай якасці рамонта сведчыць вялікая колькасць адчэпак вагонаў у пуці. У кастрычніку іх было 1910. У лістападзе 1450.

Аглядчык **Гайліш** свядома прапускаў вагоны з бракам.

Вагоннае дэпо павінна было забяспечыць маладых змазчыкаў неабходнымі інструментамі. Майстру кровельшчыку **Рахліну** было дадо задзенне зрабіць 500 маслёнак. І вось у дзень выпуска ўсе маслёнкі забракоўваюцца. Аб дэфектах зарашей ведаў майстра комуніст **Ціхаміраў**, але ніякіх мер не прыняў.

Шмат брака лічыцца за **Радкевічам, Іванавым, Аўласенка, Васкрэсенскім, Задароўскім** і інш.

Барацьба з бракаробамі, дэзарганізатарамі вытворчасці не ўзнята на належную вышыню. Аб характары барацьбы можна судзіць хоць-бы па загалах начальніка дэпо **Одынца**. У загалве № 190, пералічваючы факты агідной работы абменнага пункта, ён канчае яго такімі словамі: **«Прашу даны загад прапрацаваць сярод рабочых»**. Гэта ветлівая просьба, не знайшла водгука, прайшла міма ўсіх цэхаў і безумоўна не дасягнула сваёй мэты.

Рад комуністаў не займаюць авангардной ролі на вытворчасці. Вось члены партыі **Кісляковы, Бекаліс і Ганчароў** 7 дзён пратрымалі хворы вагон і не паставілі яго ў рамонт. Робяць часта брак. Ад іх не адстаюць комуністы **Папай і Сенкоўскі**. Аднак, бюро ячэйкі не рэагуе на гэта.

Кіраўніцтва дэпо таксама не правяла тых людзей, якія пастаўлены на адказнейшым участку чыгуначнага транспарта, людзей не вывучае, не ведае. Няма сумнення, што большасць паўторнасцяй рамонта пасавання вагонаў, парушэння працдысцыпліны ёсць справа класава-варожых элементаў, выяўленнем якіх кіраўніцтва дэпо не займалася.

Не ведае кіраўніцтва і ўдарнікаў. Мы прасілі сакратара парт'ячэйкі Дземіцава назваць нам імёны лепшых ударнікаў. Ён назваў брыгаду **Гарадзюшкі Алексея і Полкоўскага**. Між тым высветлілася, што гэтыя брыгады мелі рад паўторнасцяй рамонта.

Як працуе прафарганізацыя, кіраўніцтва якой амяшчаецца тут-жа ў дэпо? Старшыня прафарганізацыі Яцэвіч з'яўляецца пасіўным назіральнікам усіх ініцыятыў.

МК не ўзначаліў соцспаборніцтва і ўдарніцтва, не кіруе ім. Недарма ў лік ударнікаў трапілі лодыры, бракаробы і сабатажнікі.

Адной з прычын дрэннай работы дэпо з'яўляецца поўнае ігнараванне матэрыяльна-бытавых умоў рабочых. Сталоўкі ў дэпо няма. Абедаць рабочыя едуць на «літуўцы» за 6 кіламетраў. У выніку кожны дзень спазненні на цэлую гадзіну. Пытанне аб адкрыцці сталоўкі вось ужо год марыцца ў руках бюракратаў з раённага ОРС'а.

Не наладжана культурна-выхаваўчая работа.

Дрэнна падрыхтавалася дэпо і да зімы. У цэхах холадна, шыбы без шкла, цэментныя падлогі без дрыўляных насцілаў. Няспраўны сэйран для лесаматэрыялаў.

Вось сапраўднае становішча Аршанскага вагоннага дэпо. Мы не сумняваемся, што палітадзел раёна аздаровіць становішча ў дэпо, прыме неадкладныя меры, каб крута ўзняць работу.

Брыгада «Звязды»
Н. Гасман, Я. Пракаповіч.

Свабоду Дзімітраву, Торглеру, Папову, Таневу!

РУКІ ПРЭЧ!..

Гуляй фашыст —
крыцы,
ламі,
грамі.
Балой свой баль
агонні і крывавы...
Германія ў агні,
Германія ў крыві —
арэна дзікай катаўскай расправы.
Што крок —
пагром,
разгром
і турмаў лес...
Жывое ўсё
зацята ў смерці перат.
Каб гэта апраўдаць —
сфабрыкаван працэс
і прыгавор
напісаны наперад.
А суд —
паказ камедыі тупой,
дзе ролі ўсе
падзелены на дзіва:
і судзіць той,
і сведка той,
хто варты быць на лаўцы падсудзімых.
Магільных спраў
майстры і каралі —
Натхнёцелі пагромніцкіх паходаў,
Чые-ж далоні сёння у крыві
працоўнага германскага народа?..
... І падае з галяў
дожаравыйны цвет,
і праўда свеціцца
скрозь атмасферы горкай,
калі
Дзімітраўскія словы
на ўвесь свет
грымяць ад Лейпцыга,
Парыжа,
да Нью-Іорка.
Што ўвесь працэс —
да наступа сігнал,
чарговы ход
пагромніцкіх паходаў,
што не компартыі
патрэбен быў падпал,
а ворагам працоўнага народа.
Уся Германія —
фашысцкіх турмаў лес,
жывое там
зацята ў смерці перат...
Фашыстамі
сфабрыкаван працэс,
дзе прыгавор
напісаны наперад...
... На сцэне роспач,
роспач з-за куліс...
Сусветам
трук магільшчыкаў
асвістан...
Нічым
не пераможан комуніст,
Нічым змаўчаць
не змусіш комуніста.
Яго спакой —
геройскіх спраў узор;
На смерць глядзіць ён смела,
без павязкі,
і, нават
галаву пакладзіўшы пад топор,
Не пакідае зброі пролетарскай...
І разлятаецца фальшывак
брудны ліст
ад слоў Дзімітрава,
як ад пястрымнай буры:
«Компартыя —
комуніст —
не тэрарыст,
не ў шчане комунізма авантуры.»
Наш шоўнакроўны клас,
як цвет жыцця —
жывы,
ён ліцыямі на могільнік
дарог сабе не сцеліць,
За авантуры розныя
капаецеся вы,
як за саломінку хапаецца тапелец...
... І судзі ў роспачы...
а з імі каралі
магільных і пагромніцкіх паходаў...
Іх прагнасць — да крыві...
Іх рукі ўсе — ў крыві
працоўнага народа.
Бяссільнай поостаю
гарыць пяўтольнасць іх,
нібы яны —
пасаджаныя ў перат...
Не лёгка выкрэсліць
са спіскаў смерці тых,
каму прысуд
падпісаны наперад...
... Са ўсіх канцоў
мільёнаў
гнеўны смерч
На вас імчыць
найграмавое слова:
— Даволі здзекаў...
Рукі проч
ад Торглера,
ад Танева,
Дзімітрава,
Папова!

Т. Кляшторны.

МІЖНАРОДНАЯ СЛЕДЧАЯ КАМІСІЯ ВЫКРЫВАЕ САПРАЎДНЫХ ПАДПАЛЬШЧЫКАЎ

ЛОНДАН, 19 снежня (БЕЛТА).

Сёння адбылося публічнае пасяджэнне міжнароднай следчай камісіі па справе аб падпале рэйхстага. Прысутнічалі юрысты: Брантынг (Швецыя), Вернейлен (Бельгія), Баккерноргт (Галандыя) і Бержэры (Францыя).

У тэлеграме на імя камісіі Гейс (ПАЗШ) рашуча абвяргае заяву пракурора Вернера аб тым, быццам ён, Гейс, прызнаў, што працэс не даказаў удзела нацыянал-соцыялістаў у падпале.

Бержэры аналізуе матэрыялы лейпцыгскага працэса ў святле асноўных трох вывадаў камісіі. Гэтыя вывады наступныя:

1) наяўныя даныя сведчаць аб крайняй непраўдападобнасці таго, што Ван дэр-Люббе адзін зрабіў пад пал рэйхстага;

2) зусім непраўдападобна, што компартыя Германіі ў якой небудзь меры замешана ў падпале;

3) **У ПАДПАЛЕ ЗАМЕШАНЫ НА ЦЫЯНАЛ-СОЦЫЯЛІСТЫ.**

Як указаў далей Бержэры, матэрыялы лейпцыгскага працэса **ПАЦВЕРДЗІЛІ ПОЎНАСЦЮ АЛІБІ ТОРГЛЕРА, А ТАКСАМА ДЗІМІТРАВА, ПАПОВА І ТАНЕВА.** Гаворачы аб спробах некаторых сведак абвінавачання ўстанавіць сувязь паміж абвінавачанымі комуністамі і Ван дэр-Люббе, Бержэры падкрэсліў поўную супярэчнасць і непраўдападобнасць гэтых паказанняў. Бержэры падкрэсліў таксама той факт, што нібыта знойдзеныя ў доме імя Лібкнехта дакументы, на якіх пракуратура ў асноўным пабудавала свой абвінавачаўчы акт, ніколі не былі апублікаваны і не былі разгледжаны судом.

КРЫВАВАЯ ОРГІЯ ФАШЫЗМА

Яшчэ 10 рэволюцыйных рабочых пасланы на эшафот

БЕРЛІН, 20 снежня (БЕЛТА).

Вярхоўны суд у Лейпцыгу зацвердзіў вынесены ў верасні дусельдорфскім судом смяротны прыгавор 9 рэволюцыйным рабочым: Шмідту, Арэстаю, Маслаі, Тыбульскаму, Родэсу, Эгертут, Грыбландту, Герру, і Гушэрцу, якія абвінавачваліся ва ўдзеле ў сутычцы з нацыянал-соцыялістамі ў лістапе 1932 г.

Вярхоўны суд не абмежаваўся зацвярджэннем гэтага смяротнага прыгавора. Ён адначасова пастанавіў замяніць катаржны прыгавор, вынесены па гэтай-жа справе рабочаму Лукасу, смяротным.

МЕНСК

ПАРАД КАНЬКАБЕЖЦАЎ

Менская фізкультурная арганізацыя пачала падрыхтоўку да 15 з'езда КП(б)Б. У дзень з'езда адбудзецца парад тысячы канькабежцаў.

Будуць праведзены таксама індывідуальныя спаборніцтвы па простых і скорасных канках. Для ўдзелу ў спаборніцтве запрашаюцца лепшыя фігурысты Масквы і Ленінграда, а таксама вядомы майстар па скорасных канках тав. Бальшакоў.

Закончваецца ўнутрышкольны розыгрыш па шахматах і шашках. З 24 снежня пачнецца гарадскі розыгрыш для выяўлення зборнай каманды па шахматах і шашках ад Менска на ўсесаюзны спаборніцтвы школьнікаў.

РАДЫЁДОМ У МЕНСКУ

У МЕНСКУ Ў 1934 ГОДЗЕ ПАЧЫНАЕЦЦА ПАБУДОВА ПЕРШАГА Ў БССР РАДЫЁДОМА. У РАДЫЁДОМЕ БУДУЦЬ АБСТАЛЯВАНЫ 10-12 СТУДЫЙ, СПЕЦЫЯЛЬНАЯ СТУДЫЯ ДЛЯ ТЭЛЕВІДЗЕННЯ І СТУДЫЯ ДЛЯ МЕХАНІЧНАЙ МУЗЫКІ — ТОНАФІЛЬМАЎ. У ІМ-ЖА БУДЗЕ РАДЫЁТЭАТР НА 1.000 МЕСЦ.

АГУЛЬНЫ КОШТ БУДАЎНІЦТВА І АБСТАЛЯВАННЯ — КАЛЯ 3 МЛН. РУБ. НА 1934 Г. АДПУШЧАНА 1½ МЛН. РУБ. СКЛАДАН НЕ ПРАЕКТА ДАРУЧАНА КІРАЎНІЦТВУ ПА БУДАЎНІЦТВУ МАСКОЎСКАГА РАДЫЁДОМА ПРЫ УСЕСАЮЗНЫМ КАМІТЭЦЕ ПА РАДЫЁФІКАЦЫІ.

ЗДАЧА РАДЫЁДОМА Ў ЭКСПЛАТАЦЫЮ НАМЯЧАЕЦЦА Ў 1935 Г.

СОВЕЦКІ ДЗЕНЬ НА ФАБРЫКАХ І ЗАВОДАХ

19 снежня на фабрыках і заводах Менска праведзен адзіны совецкі дзень, прысвечаны пастанове прэзідыума ЦВК СССР аб рабоце Менска та гарсовета і справаздачам дапутатаў іх груп і членаў совета.

На гарбарні «Большэвік» з вялікім дакладам выступіў старшыня ЦВК СССР і БССР тав. **Чэрвякоў.**

Адзіны совецкі дзень працоў вельмі ажыўлена. У спрэчках ударнікі прадпрыемстваў падкрэслівалі правільнасць указаняў ЦВК СССР аб неабходнасці гарадскому совету аддаць больш увагі паляпшэнню культурна-бытавога абслугоўвання рабочых і асабліва ў галіне жылёвага будаўніцтва.

ВЫСТАУКА „10 ГОД БЕЗ ЛЕНІНА"

Музей рэволюцыі адзначае дзесяцігоддзе з дня смерці Леніна выстаўкай «10 год без Леніна—па ленінскаму шляху». Выстаўка адкрыецца гэтымі днямі.

Партыцат БССР выпускае з друку 7 брашур Леніна, а таксама «Заветы Леніна», Сталіна, «Біяграфія Леніна»—Ярославскага, і ўспаміны аб Леніне Крупскай, Гарбунова, Семашка і Анікеева.

МІЖНАРОДНЫ МАТЧ БАТВІНІК—ФЛОР

РЭЗУЛЬТАТ—НІЧЫЯ

ЛЕНІНГРАД, 19 СНЕЖНЯ.

12-Я ПАРТЫЯ МАТЧА ФЛОР-БАТВІНІК ЗАКОНЧЫЛАСЯ УНІЧЫЮ, ТЫМ САМЫМ УНІЧЫЮ ЗАКОНЧЫЎСЯ І ЎВЕСЬ МАТЧ. КОЖНЫ З ПАРТНЁРАЎ МАЕ ПА 2 ВЫГРАНЫХ І 8 УНІЧЫЮ.

ЮБІЛЕЙ ВЧК-АДПУ І ЭПРОН'а

МАСКВА, 20 снежня. (БЕЛТА).

Слаўнай гадавіне аголенага мяча пролетарскай дыктатуры, 16-годдзю ВЧК-АДПУ і 10-годдзю чырвонасцяжнага ЭПРОН'а адводзяць сёння цэнтральныя газеты рад палітычна насычаных яркіх матэрыялаў.

16 год ВЧК-АДПУ, — адзначаюць газеты, — адна з самых выдатных геройчных старонак у гісторыі барацьбы пашага пролетарыята і яго партыі за ўладу совецаў, за ўмацаванне дыктатуры пролетарыята.

Чырвонасцяжны ЭПРОН, упісаўшы не мала бліскучых старонак у барацьбу з водпай стыхіяй, адзіраўшых свет геройствамі сваіх вадалазаў-падводнікаў, створаны па ініцыятыве т. т. Дзяржынскага і Ягоды, з'яўляецца дзіцём ВЧК-АДПУ.

У «Правде», у артыкуле Мейера, даны запамінаючыяся даты пройдзе нага ЭПРОН'ам шляху з моманта пачатка пад'ёма «Чорнага прынца» у Балаклаўскай бухце ў 1923 г. да пад'ёма «Сацко» і падводнай лодкі № 9, пад'ём якой з глыбіні 100 метраў паставіў экспедыцыю ў сусветныя рэкардысты глыбаводных работ.

Прыгунская працкомуна імя Баліцкага, вырасшая ў магутны камбінат перапрацоўкі людзей і стварэння матэрыяльных цэнтрасцяй, — піша ў «Правде» Ілін, — комуна прайшла шлях ад дзверных взамкоў і петляў да завода супортна-шліфавальных варштатаў, якія раней не вырабляліся ў СССР.

«—И какой бы не был вражий крыступ на справу всесильного труда, поколения славные чекистов никогда не дрогнут, никогда, — заканчваецца верш Пракоф'ева «ВЧК-ОГПУ», змешчаны ў «Известиях».

«Известия» даюць вытрымку з стенограмы гутаркі Дзяржынскага з Луначарскім, дзе Дзяржынскі гаворыць: «Я хачу кінуць некаторую частку маіх асабістых сіл, а, галоўнае, сіл ВЧК на барацьбу з дзіцячай беспрытульнасцю. Бо, калі глядзіш на дзяцей, дык не можаш не думаць: «Усё для іх. Плады рэволюцыі не нам, а ім».

«Известия» даюць вялікі нарыс Гарры «Святочный рассказ». Нарыс дыяметральна процілеглы буржуазным сантыментальна-сюсюкаючым на рысам аб злосчасных, замярзаючых пад каляды. Нарыс гаворыць мовай класавай праўды аб тым, як выратаваны ў марозную ноч, беспрытульнія Грыша Катляренка падаў у працоўную комуну імя Дзяржынскага і як ён у гэтай комуне знайшоў сваё ўласнае месца ў жыцці, апрымаў «пущёўку ў жыццё».

Тры газеты прысвячае «Комсомольская правда» настойнаму вартаўніку рэволюцыі АДПУ і героям-падводнікам чырвонасцяжнага ЭПРОН'а.

«Схіляюся перад подпоўнай энергіяй вашых таварышоў. Вы, і падобныя вам героі працы, даказалі пролетарыям усёй зямлі непахіснуталыную сілу рабочага класа, разарваўшага ланцугі капіталізма» — вітае **МАКСІМ ГОРКІ ЭПРОНАЎЦАЎ.**

Юбіляра-чырвонасцяжніка вітаюць таксама ЦК ВЛКСМ, наркамвод Янсон і інш.

«Комсомольская правда» змяшчае артыкулы кіраўніка чырвонасцяжнага ЭПРОН'а Крылова, лепшага вадалазніка-смыбоазводніка Гутта і інш.

«За мінулыя гады, — піша Крылоў, — ЭПРОН'ам паднята і выратавана 110 суднаў. З іх 74 пайшло на адналенне і папаўненне магутнасцей нашага галадзёвага флота. Былі слаўныя справы за гэтыя гады. Сілай нас напоўніла геройчна выкананая пролетарыятам пяцігодка, і з кожным нашым поспехам мы адчуваем геніяльнасць генеральнай лініі партыі, магутнасць арганізатара і кіраўніка ўсіх перамог у нашай краіне — Цэнтральнага Камітэта партыі і нашага глыбока любімага рулявога т. Сталіна».

Мы праводзілі работы, — піша вадалазнік Гутт, — на глыбіні 50 сажняў. Гэта работа нам давялася ўпяршыню. Вадалазны склад нават і не думаў, што можна дайсці да такой глыбіні».

Тры газеты юбілею адводзяць «Водный транспарт» пад лозунгам «У нас не было падводнай тэхнікі, яна ў нас цяпер ёсць». У кліцкай падборцы газета дае выказванні рэвых вадалазаў-ударнікаў морскіх бітваў, перамагаючых падводную хію большэвіцкай мужнасцю.

СУСТРЭЧА ПІСЬМЕННІКАЎ З САРАЙ ФІБІХ

У Доме пісьменніка адбылася сустрэча вядомай спявачкі, выканаўцы яўрэйскай народнай песні, амаль адзінай у свайм жанры **САРЫ ФІБІХ** з прадстаўнікамі яўрэйскай пісьменніцкай і тэатральнай грамадскасці Менска.

Вечар сабраў шматлюдную аўдыторыю, у тым ліку шмат гасцей—беларускіх, польскіх совецкіх пісьменнікаў і кампазітараў.

З уступным словам выступіў на вечары заслужаны артыст рэспублікі тав. **М. Ф. РАФАЛЬСКІ.**

САРА ФІБІХ праспявала рад яўрэйскіх народных песень і пакладзеных на музыку вершаў сучасных яўрэйскіх паэтаў—І. Фефера, І. Харыка і інш.

У заключэнне быў выкананы абмен думкамі.

ПАВЕДАМЛЕННІ

ПК ЦКК КП(б)Б паведамляе, што 29-XII-33 г. у 10 гадзін раніцы (Менск, Дом Урада, 4-ты паверх, пакой 458) на пасяджэнні Парыкалегіі ЦКК будуць разглядацца партсправы наступных т.т.:

Рычагова І Ф., Глезера Я. І., Кевіна І. І., Сінькко Я. Ц., Сакаўчыка В. У, Пучко П. К., Гайдука А. І., Шэўчанка Т. М., Бондабава І. І., Спонягва П. Ф., Лукашэнка С. С., Клецко М. С., Цімашэнка М. А., Шляхценка А. Р., Бабіцкага І. Н., Харытоненка Н. І., Сліжыкава М. Е., Дзехцярова П. І., Белага М. В., Кляўзера Н. П, Камісарчык С. Б., Камісарчык Г. М.

Яўка пералічаных таварышоў абавязкова.

Праезд не аплачваецца.

Партканегія.

***

ПАРТКАЛЕГІЯ ЦКК паведамляе, што пасяджэнне партканегіі ЦКК з 22 снежня ПЕРАНОСІЦЦЯ на 25 а 6 гадзіне вечары.

Культпрогам ЦК КП(б)Б, 22-XII 1 6 падз. вечара ў залой №10 [illegible] каецца нарада па пытанню пра[illegible] палітработы ў прафсаюзных арганізацыях.

На нараду запрошаны з'яўляцца наступныя т.т.

Клебанаў (ЦП РДУ), Леніна (ЦП Гандаль каап.), Стэрлін (ЦП Менскбуд), Фіш (ЦП шпейнікаў), Рагапарт (ЦП РЗС), Корзін (РЖС), Шупенко (МТС), Рохкін (ЦП гарбарэў), Будзіл (ЦП друкароў), Клінус (ЦП шофераў), Шчэрбацэвіч (Лесасплаў), Кержынскі (прац мастацтва), Нарашчэнка (прац асветы), Крэйнін (прамкамжылбудоў), Маслянкі (гарпрафсавет), Крупскі (райпрафсавет; рабфаком І-й Большэвіцкай МТС, Флюксман (заўком «Большэвіка»), Кітарныя заўком «Комунар».

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

БДТІ—Першы Дзяржаўны тэатр
Мастацкі кіраўнік П. М. Літвінаў
5 студзеня 1934 г.)—(Пачатак спектакляў
КУЗЬМА ЧОРНЫ
„БАЦЬКАЎШЧЫНА"
Новы літаратурны тэкст (3-ці акт)
НОВАЕ АФАРМЛЕННЕ.
Н. КРАПІВА
„КАНЕЦ ДРУЖБЫ"
Па Проперу Корыце
літ. адпрац. П. Літвінава
„ЖАКЕРЫЯ"
Пераклад П. Глебкі.
ФАНВІЗІН
„НЕДАРАСЛЬ"
Пераклад К. Крапівы.
Прымаюцца Заяўкі на матэвыя спектаклі ў канторы тэатра і ў рабочай касе.
Дырэкцыя.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЯЎРЭЙСКІ ТЭАТР БССР
вул. Валадарскага, 7, тэл. № 21-813, 23-554, 24-122)
Адкрытыя спектаклі
22, 23, 24, 25 снежня
ПАРТЫЗАНЫ
пастаноўка М. Ф. РАФАЛЬСКАГА.
Пачатак у 8 гадз. вечара
Білеты ў рабочай касе і ў каса тэатра.

ГУКАВЫ кіно-тэатр ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА — Гукавы гаварашчы фільм Канвеер смерці
Каса—ад 1г. дня
КІНО Пролетарый — Замежны мастацкі фільм ДЗЯЎЧЫНА з КАБАРЭ (Камілла) др. у 6 ч.
КІНО Пятырнацыянал — Рычард Талядж у замежнай камедыі Ваагражальны Атарней
ДЗІЦЯЧЫ ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР — Гукавы мастацкі фільм БЛАКІТНЫ ЭКСПРЭС

СЁННЯ, 21 снежня на фабрыцы „Кастрычнік" у памяшканні клуба ў 3 гадз. дня.
скліканецца
пасяджэнне аб'яднанага прэзідыума Цэнтральнага совета т-ва „Прэч непісьменнасць" БССР і гарсовета „ПН"
ПАРАДАК ДНЯ:
1) Выступленне Старшыні ЦВК БССР і Старшыні ЦС Т-ва „ПН" тав Чэрвякова па ўключэнню Усебеларускага Т-ва „ПН" у паход імя XVII з'езда ВКП(б) і XV з'езда КП(б)Б.
2) Справаздачы па ліквідацыі малапісьменнасці і непісьменнасці даюць наступныя прадпрыемствы: ф-ка „Кастрычнік", завод імя Варашылава, ф-ка, „КІМ", абутковая ф-ка, ф-ка „Комунарка", Гарана. Справаздачы мець у пісьмовай форме.
За яўку вышэйпаказаных прадпрыемстваў і дэлегацыі ад усіх фабрык і заводаў гор. Менска адказнасць усклядаецца на трыкутнікі.
ГК КП(б)Б
ЦС Т-ва „ПН" БССР
Гарпрафсавет

ДА ВЕДАМА пазыкатрымальнікаў, аблігацыі якіх хаваюцца у Менскай гарашчадкасе № 16
з прычыны ўтварэння рэвізіі кладавой
СПЫНЯЕЦЦА усякая ВЫДАЧА АБЛІГАЦЫЙ ПА ХАВАННЮ
(кліенцкаму партфелю) з 24 па 31 снежня ўключна
Менгарашчадкаса № 16.

КІНО „СПАРТАК" — з 21 снежня замежны фільм ВАР'ЕТЭ драма ў 7 частках У ГАЛОЎНЫХ РОЛЯХ Эміль Янінго Ліа Де-Путці
У праграме Саюзкінохроніка № 18 —1933 г.
„ЗА СОЦЫЯЛІСТЫЧНУЮ ВЁСКУ"
Штодзенна 5 сеансаў Каса—з 4-х гадзін.

Тэлефон сектара абвестак № 21-360

БЕЛВОДГАС НАРКАМЗЕМА БЕЛ. з 1 студзеня 1934 г. адкрывае трохмесячныя курсы качагараў і машыністаў-рычажнікаў (драгераў)
па экскаватарнай справе пры Ярэскім мелібудучастку (Любаньскі раён).
Прымаюцца асобы, скончыўшыя семігодку, а таксама з адукацыяй пяцігодкі, але маючыя працоўны стаж не менш двух гор на рабоце ў якасці елесарэ, токара або на рухавіках паравых і ўнутранага згарання. Да заяў прыкладваюцца дакументы аб адукацыі, соцпахаджанні, аб выторчым стажы. Узрост не ніжэй 18 год. Даецца кватэра, стыпендыя ў размеры 120 руб. у месяц і навучальныя прылады. Ёсць сталоўка, рабкоп. Праезд да месца курсаў аплачваецца.
Па скончэнні курсаў абавязкова працаваць у сістэме Белводгаса не менш двух год. Заявы падаваць да 25-12 г.г. у Белводгас (г. Менск, вул Энгельса, 28, трэці паверх, сакратарыят).
БЕЛВОДГАС.

МЕНСКІ ГАРАДСКІ ФІНАНСАВЫ АДДЗЕЛ
на падставе пастановы НКФ СССР ад 7-IX—1930 г. № 624
ПРАПАНУЕ:
УСІМ ніжэйпералічаным прадпрыемствам і арганізацыям, якія знаходзяцца на тэрыторыі гор. Менска і прыгараднага раёна і якія абавязаны тымі ці іншымі плацяжамі ў бюджэт,
ЗАРЭГІСТРАВАЦЦА ў гарфінаддзеле на 1934 год шляхам падачы рэгістрацыйнай заявы па ўстаноўленай форме:
ТЭРМІН РЭГІСТРАЦЫІ—да 30 снежня 1933 года.
РЭГІСТРАЦЫІ ПАДЛЯГАЮЦЬ:
прадпрыемствы дзяржаўнай і камунальнай прамысловасці, фабрыкі, заводы, майстэрні, арганізацыі сматужна-прамысловай і сельска-гаспадарчай кооперацыі, ОРС'ы, сель-спажыўтаварыствы і інш. арганізацыі спажывецкай і інвалідзкай кооперацыі, прадпрыемствы дзяржгандля, транспартныя і пагрузачна-разгрузачныя арганізацыі, будаўнічыя і архітэктурныя канторы пры ўсіх пабудовах, аб'яднанні, трэсты, базы, склады, розныя філіялы, канторы, снабзбыты, агенцтвы, бюро, кансультацыі і ўпаўнаважэнні, прадпрыемствы грамадскіх арганізацый, таварыствы, экспартныя арганізацыі, друкарні і граверныя майстэрні, навучальна-выторчыя ўстановы і фабзавучы, прадпрыемствы калгасаў, соўгасы і ўсе сельскія гаспадаркі пры арганізацыях, прадпрыемствах, установах і вайсковых часцях, адкрытыя прадпрыемствы для прынясця яды і напіткаў, буфеты і ўсе заведкрытыя сталоўкі, дзе прадаюцца піва, папросы ці кандытэрскія вырабы, а таксама ўсе іншыя арганізацыі, якія займаюцца прамысловай і гандлёвай дзейнасцю.
Прадпрыемствы з разгалінаванай сеткай да рэгістрацыйнай заявы прыкладаюць спіс аперацыйных адзінак.
Тыя з пералічаных арганізацый і прадпрыемстваў, якія абкладаюцца падаткам са зварота, бюджэтнымі нацэнкамі і інш. плацяжамі ў цэнтралізаваным парадку Наркамфінам БССР або фінорганамі іншых гарадоў і мясцовасцяй СССР абавязаны замест рэгістрацыйнай заявы прадставіць фінаддзелу не пазней 10-га студзеня 1934 г. даведку па ф. № 4.
Рэгістрацыйных заяў не прадстаўляюць толькі тыя адзінкі мясцовага значэння, звароты якіх абкладаюцца Менскім гарфінаддзелам у складзе ўсёй арганізацыі, нулы ўваходзяць гэтыя адзінкі (напрыклад: крамы горгандлю, ЗРКопаў, ОРС'аў, Белгандлю і інш.
Бланкі рэгістрацыйнай заявы і бланкі даведкі ф. № 4 выдаюцца ў гарфінаддзеле (вул. Карла Маркса, 14, 1-шы паверх, пакой № 9).
За ўхіленне ад рэгістрацыі вінаватыя будуць штрафавацца ў памеры да 100 рублёў.
15-XII—1933 г. МЕНСКІ ГАРФІНАДДЗЕЛ.

ПАДПІСВАЙЦЕСЯ на 1934 год
на цэнтральную ўсебеларускую газету
„ЗВЯЗДА"
Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР
газеце „ЗВЯЗДА" будуць шырока асвятляцца ўсе матэрыялы XV з'езда КП(б)Б і XVII з'езда ВКП(б).
ПАДПІСНАЯ ЦАНА:
на 1 мес.—2 р. 40 к., на 3 мес.—7 р. 20 к., на 6 м.—14 р. 40 к., на 12 м.—28 р. 80 к.
Падпіска прымаецца: Поштай і лістаносцамі, упаўнаважанымі па распаўсюджванню друку на прадпрыемствах, ва ўстановах, а таксама газетнымі кіёскамі

Даводзіцца даведама зацікаўленых арганізацый, што снабжэнне Івановаўскай вобласці, ЧАВ, Беларускай ССР, Горнаўсяга края, Чувашскай аўтаномнай вобласці, Татарэспублікі
Каўказскімі натуральнымі мінеральнымі водамі
(НАРЗАН, ЕСЕНТУКІ СМІРНОЎСКАЯ, СЛАВЯНСКАЯ, БАТАЛІНСКАЯ)
у 1934 годзе будзе ўтварацца праз МАСКОЎСКУЮ КАНТОРУ І СКЛАД
„КАВМИНРОЗЛИВА".
Прапануецца падаць ЗАЯЎКІ на 1934 год у публічным выліччэнні, з паказаннем патрэбы па месяцах, не пазней 25 снежня 1933 года.
ЗАЯЎКІ НАКІРОЎВАЦЬ: Москва, центр, площадь Свердлова, 2-10, пом. 6, Кавминрозливу.

Белканторы „САЮЗУЦІЛЬ"
ПАТРЭБНЫ
рэспубліканскія інструктары для абслугоўвання перыферыі,— спецыялісты уцільнай справы, а таксама спецыяліст па нарэтнаму валенню.
Белкантора „Саюзуціль", вул. Дзем'яна Беднага № 8, тэл. 27-186.

Віцебскаму вытворчаму уцільнакамбінату „Саюзуціль" патрэбны на сталую працу
інжынер, або вопытны тэхнік-будаўнік, прадстаўляючы кватэру.
З прапановай звяртацца—г. Віцебск, Комсамольская, 116, вытворчы Уцільнакамбінат.

Гапоўліт № 337.